Генадзь Андрэевіч Богдан

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Генадзь Андрэевіч Бо́гдан (нар. 8 студзеня 1977) — беларускі дзяржаўны дзеяч. Намеснік кіраўніка справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2020—2022). Фігурант Чорнага спісу Еўрасаюза, санкцыйных спісаў шэрагу іншых краін.

Генадзь Андрэевіч Богдан	
Нараджэнне	8 студзеня 1977 (46 гадоў)
Адукацыя	Мар'інагорскі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж імя У. Е. Лабанка БДАТУ
Месца працы	Белдзяржхарчпрам Мазырсоль

Біяграфія

Скончыў Мар'інагорскі саўгас-тэхнікум, затым Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт.

Два гады працаваў інспектарам дзяржаўнага пажарнага нагляду ў сістэме Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь.

З 1999 па 2012 год працаваў у канцэрне «Белдзяржхарчпрам», дзе стаў у выніку начальнікам упраўлення каардынацыі і развіцця галін па вытворчасці прадуктаў харчавання і тытунёвых вырабаў.

З 1 лютага 2012 года працаваў генеральным дырэктарам ААТ «Мазырсоль»[1]. У 2016 годзе стаў лаўрэатам конкурсу «Чалавек справы» ў намінацыі «За стабільную і эфектыўную працу на беларускім і замежным рынках»[2].

У другой палове 2010-х гадоў узначальваў Рэспубліканскае вытворча-гандлёвае ўнітарнае прадпрыемства «Беларусьгандаль», якое ўваходзіць у сістэму Кіраўніцтва справамі прэзідэнта.

Абіраўся дэпутатам Мазырскага раённага савета дэпутатаў 27-га і 28-га[3] скліканняў.

30 студзеня 2020 года прызначаны намеснікам кіраўніка справамі прэзідэнта Рэспублікі Беларусь[4]. Пакінуў пасаду ў верасні 2022 года[5].

Міжнародныя санкцыі

31 жніўня 2020 года ўключаны ў спіс асобаў, на якіх накладзена бестэрміновая забарона на ўезд у Латвію, пяцігадовая забарона на ўезд у Эстонію і забарона на ўезд у Літву ў сувязі з тым, што *«сваімі дзеяннямі ён арганізаваў і падтрымаў фальсіфікацыю прэзідэнцкіх выбараў 9 жніўня і наступнае гвалтоўнае здушэнне мірных пратэстаў»*[6].

17 снежня 2020 года ўнесены ў Чорны спіс Еўрасаюза. Савет Еўрапейскага саюза прызнаў Богдана як намесніка начальніка ўпраўлення кіравання маёмасцю Кіраўніцтва справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, які курыруе шматлікія прадпрыемствы і праз кіраўніцтва справамі аказвае фінансавую, матэрыяльна-тэхнічную, сацыяльную, бытавую і медыцынскую падтрымку дзяржапарату і рэспубліканскім органам

улады, і цесна звязанага з прэзідэнтам адказным за падтрымку рэжыму Лукашэнкі[7]. 26 студзеня 2021 года да санкцый ЕС далучыліся Албанія, Ісландыя, Ліхтэнштэйн, Нарвегія, Паўночная Македонія, Чарнагорыя[8]. 18 лютага 2021 года ў свой санкцыйны спіс Богдана дадала Вялікабрытанія [9], 22 сакавіка 2021 года — Швейцарыя[10].

Зноскі

1. Генеральным директором ОАО «Мозырьсоль» назначен Геннадий Богдан (https://gomel.today/rus/news/gomel/18360/) (недаступная спасылка)
2. Пресс-релиз. Человек Дела-2016. Три кита успеха (https://bspn.by/images/PRESS_R_2016_LAST.pdf)
3. Рабочие органы Мозырского районного Совета депутатов (http://mozyrisp.gov.by/ru/rabogie_organu/)
   Архівавана (https://web.archive.org/web/20211022222201/http://mozyrisp.gov.by/ru/rabogie_organu/) 22 кастрычніка 2021.
4. Указ Президента Республики Беларусь от 30 января 2020 года № 34 «О Г. А. Богдане» (https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=P32000034&p1) (недаступная спасылка)
5. Николай Рогащук освобожден от должности помощника Президента - инспектора по Гомельской области (https://president.gov.by/ru/events/nikolay-rogashchuk-osvobozhden-ot-dolzhnosti-pomoshchnika-prezidenta-inspektora-po-gomelskoy-oblasti)
6. Латвія, Літва і Эстонія ўключылі Лукашэнку і яшчэ 29 чыноўнікаў ў спіс пэрсон нон-грата. ПОЎНЫ СЬПІС (https://www.svaboda.org/a/30812996.html)
7. Council implementing regulation (EU) 2020/2129 of 17 December 2020 implementing Article 8a(1) of Regulation (EC) No 765/2006 concerning restrictive measures in respect of Belarus (https://eur-lex.europa.eu/eli/reg_impl/2020/2129/oj)
8. Declaration by the High Representative on behalf of the European Union on the alignment of certain countries concerning restrictive measures against Belarus (https://www.consilium.europa.eu/en/press/press-releases/2021/01/26/declaration-by-the-high-representative-on-behalf-of-the-european-union-on-the-alignment-of-certain-countries-concerning-restrictive-measures-against-belarus/) (англ.). Савет Еўрапейскага саюза (26 студзеня 2021). Праверана 9 верасня 2021.
9. Госдепартамент США ввел санкции против 43 граждан Беларуси, в британском списке — 27 новых фамилий (https://people.onliner.by/2021/02/19/ssha-vveli-sankcii-protiv-43-grazhdan-belarusi) (руск.). *Onliner.by* (19 лютага 2021). Праверана 9 верасня 2021.
10. Searching for subjects of sanctions (https://www.seco.admin.ch/seco/en/home/Aussenwirtschaftspolitik_Wirtschaftliche_Zusammenarbeit/Wirtschaftsbeziehungen/exportkontrollen-und-sanktionen/sanktionen-embargos/sanktionsmassnahmen/suche_sanktionsadressaten.html)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Генадзь_Андрэевіч_Богдан&oldid=4266747"